**Білет 13**

**Практычнае заданне.**

**Партызанскі рух і падпольная барацьба на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Прывядзіце факты, якія даказваюць, што барацьба супраць нацыстаў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі мела масавы характар.
2. Для чаго камуністы і камсамольцы заставаліся на акупіраванай тэрыторыі Беларусі?
3. Якія задачы ставіў ЦК КП(б)Б партыйным, савецкім і камсамольскім органам у тыле ворага? Прывядзіце факты, якія сведчаць аб выкананні пастаўленых задач.
4. Складзіце лагічны ланцужок, які ўстанаўлівае прычынна-выніковую сувязь паміж партызанскім і падпольным рухам на акупіраванай тэрыторыі БССР і перамогай СССР у Вялікай Айчыннай вайне.

**І. З дырэктывы ЦК КП(б)Б партыйным, савецкім і камсамольскім арганізацыям па разгортванні партызанскай вайны ў тыле ворага** *(1 ліпеня 1941 г.)*

1. Фашысцкая Германія напала на Савецкі Саюз… Неабходна дзейнічаць, не губляючы ні хвіліны, і вораг павінен быць знішчаны.
2. Усе мясцовасці Беларусі, занятыя ворагам, павінны неадкладна пакрыцца густой сеткай партызанскіх атрадаў, якія вядуць бесперапынную жорсткую барацьбу на знішчэнне ворага.
3. У раёнах і сёлах ствараюцца падпольныя партыйныя і камсамольскія ячэйкі, галоўная задача якіх - мабілізацыя народа на бязлітасную расправу з ворагам. Для гэтай мэты ўсе камуністы і камсамольцы, здольныя насіць зброю, застаюцца на тэрыторыі, занятай ворагам. <…>
5. Цвёрда памятаць, што партызанская барацьба не мае нічога агульнага з чакальнай, пасіўнай тактыкай. Яна мае баявы наступальны характар. Не трэба чакаць ворага - трэба яго шукаць і знішчаць.
6. Задачы партызан: знішчаць усякую сувязь у тыле ворага, узрываць і псаваць масты, дарогі, падпальваць склады паліва і харчаванне, аўтамашыны, самалёты, уладкоўваць крушэнні цягнікоў. Знішчаць ворагаў, не даваць ім спакою ні днём ні ўначы. Забіваць іх усюды. <…>
8. <…> Хай адчуе вораг, як гарыць пад ім наша зямля. Дзейнічайце смела, рашуча, перамога за намі. Няма такой сілы, якая магла б заваяваць савецкі народ.

**ІІ. Аб партызанскім і падпольным руху на акупіраванай тэрыторыі БССР** *(па матэрыялах вучэбных дапаможнікаў: «Гісторыя Беларусі. 1917 г. – пачатак ХХІ ст. 9 клас», «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны»)*

На акупіраванай гітлераўцамі тэрыторыі БССР разгарнуўся партызанскі і падпольны рух. 374 тыс. партызан і звыш 70 тыс. падпольшчыкаў вялі барацьбу за свабоду і незалежнасць сваёй краіны. Такога ўздыму партызанскага і падпольнага руху не ведала ніводная краіна Еўропы.

Партызанскія атрады былі арганізаваны на тэрыторыі Беларусі ў першыя дні вайны. Арганізатарамі партызанскага руху з'яўляліся камуністы і беспартыйныя актывісты, былыя вайскоўцы і камандзіры Чырвонай Арміі. Сярод арганізатараў першых партызанскіх атрадаў на тэрыторыі Беларусі - В.З. Корж, Ц.П. Бумажкоў, Ф.І. Паўлоўскі.

Партызаны вялі «рэйкавую вайну»: узрывалі чыгункі і масты, выводзілі са строю паравозы і вагоны з мэтай дэзарганізацыі германскіх ваенных перавозак. За тры гады гераічнай барацьбы ў тыле ворага беларускія партызаны і падпольшчыкі знішчылі больш за 500 тыс. гітлераўцаў, разграмілі 29 чыгуначных станцый, 948 штабоў і гарнізонаў, пусцілі пад адхон 11 128 эшалонаў і 34 бронецягнікі праціўніка; збілі і спалілі на аэрадромах 305 самалётаў, падбілі 1355 танкаў і бронемашын, знішчылі 939 вайсковых складоў.

Для каардынацыі партызанскай дзейнасці 30 мая 1942 г. быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху (ЦШПР) пад кіраўніцтвам П.К. Панамарэнкі.

У канцы 1943 г. партызанам удалося вызваліць і кантраляваць каля 60 % акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Тут ствараліся партызанскія зоны. Іх было больш за 20. У партызанскіх зонах усталёўвалася Савецкая ўлада. У іх знаходзілі сховішча тысячы мірных жыхароў. Сяляне апрацоўвалі і засявалі зямлю. Працавалі школы і бібліятэкі. Тут ішла падрыхтоўка да баявых аперацый, размяшчаліся аэрадромы, якія прымалі самалёты з «Вялікай зямлі».

Вялікі ўклад у перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне ўнеслі падпольшчыкі. Патрыятычнае падполле вяло нелегальную дзейнасць на акупіраванай тэрыторыі, накіраваную на супрацьдзеянне палітыцы акупантаў. У большасці акупіраваных гарадоў, раённых цэнтраў і буйных населеных пунктаў БССР былі створаны нелегальныя арганізацыі. Дзейнай формай барацьбы з'яўляліся дыверсіі на ваенных складах, у сховішчах паліва праціўніка. Падпольшчыкі выводзілі са строю абсталяванне прамысловых прадпрыемстваў, знішчалі і псавалі гатовую прадукцыю. Важнае месца ў дзейнасці падпольшчыкаў займалі агітацыйна-прапагандысцкая праца сярод насельніцтвы і вядзенне разведкі. Патрыёты здзяйснялі дыверсіі супраць кіраўнікоў акупацыйных уладаў і іх паслугачоў, таемных агентаў СД. Так, у ноч на 22 верасня 1943 г. удзельніцы Мінскага патрыятычнага падполля А.Р. Мазанік, Н.В. Траян і М.Б. Осіпава ажыццявілі аперацыю па знішчэнні генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ.

Аперацыі партызан па знішчэнні транспартных вузлоў дапаўняліся дыверсіямі падпольшчыкаў. Адну з самых буйных дыверсій здзейсніў падпольшчык Ф. Крыловіч на чыгуначнай станцыі Асіповічы ў ноч на 30 ліпеня 1943 г. У выніку згарэлі 4 эшалоны, у тым ліку эшалон з новымі танкамі «Тыгр», які накіроўваўся ў раён Курска. Было знішчана 30 танкаў (такую колькасць германская прамысловасць выпускала за месяц).

Партызанскі і падпольны рух у БССР быў адным з важных фактараў разгрому ворага, а Беларусь увайшла ў гісторыю як "партызанская рэспубліка".

### III. «Рэйкавая вайна» на акупіраванай тэрыторыі Беларусі (1943–1944 гг.)

